КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________А.В. Макоўчык
___ 06 ____________2022
Рэгістрацыйны № УД-____ вуч. /
УД 26-1-№ 923-2022/уч.

**КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ (СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ – XVIII ст.)**

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

2022 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені (пакаленне 3+) спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.04 2022 г., рэгістрацыйны № 85 і вучэбнага плана спецыяльнасці: 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, зацверджанага 23.06.2022, рэгістрацыйны № 082-2022/у

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Н.В.Барабаш, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.В. Мартынюк, загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

В.А.Йоцюс, дацэнт кафедры кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі , кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар дзяржаўнай ўстановы адукацыі
“Гімназія № 40 г. Мінска” І.А.Бабкоў

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
(пратакол № 11 ад .28. 05. 2022).

Загадчык кафедры С.А. Талмачова

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка” (пратакол № ад 2022).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела БГПУ Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Культура Беларусі (са старажытных часоў – XVIII ст.)” абумоўлена неабходнасцю выпрацоўкі аб’ектыўнага навуковага погляду на гісторыю культуры беларускага народа, які сфарміраваўся ў працэсе ўзаемадзеяння разнастайных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў. Гэта з’яўляецца абавязковай умовай забеспячэння падрыхтоўкі не толькі спецыяліста-прафесіянала, але і фарміравання ў асобы якасцей грамадзяніна і патрыёта.

Вучэбная дысцыпліна “Культура Беларусі (са старажытных часоў – XVIII ст.)” заклікана замацаваць у студэнтаў сістэматычныя веды ў галіне гісторыі айчыннай культуры як на ўзроўні фактаў, так і іх тэарэтычнага і канцэптуальнага асэнсавання; сфарміраваць уяўленне аб месцы і ролі культуры Беларусі ў гісторыі беларускага народа, у гісторыі еўрапейскай і сусветнай культуры; выхоўваць пачуццё патрыятызму і гонару за беларускі народ, раскрыць яго дасягненні ў гістарычным мінулым і на сучасным этапе.

Асаблівасцямі дадзенай праграмы з’яўляюцца ўдасканаленне зместу дысцыпліны, забеспячэнне фундаментальных ведаў аб культурным жыцці беларускага народа на працягу гістарычнага развіцця, а таксама павелічэнне ролі і ўдзельнай вагі самастойнай работы студэнтаў, выкарыстанне прафесійнага, кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні, магчымасць выкарыстання сучасных інавацыйных тэхналогій.

**Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны** – раскрыць сутнасныя асаблівасці беларускай культуры, заканамернасці яе гістарычнага развіцця, паказаць значэнне мастацтва, рэлігіі і навукі як універсальных каштоўнасцяў чалавецтва.

**Задачы вывучэння вучэбнай** дысцыпліны складаюцца ў набыцці студэнтамі кампетэнцый, аснову якіх складае здольнасць да самастойнага пошуку вучэбна-інфармацыйных рэсурсаў, авалодання метадамі набыцця і асэнсавання ведаў:

- спецыфіцы і заканамернасцях развіцця асноўных дасягненняў беларускай культуры са старажытных часоў да XVIII ст.;

– гісторыі ўзнікнення ўнікальных гістарычных помнікаў айчыннай культуры са старажытных часоў да XVIII ст.;

- фарміраванне полікультурнага светапогляду, талерантнага стаўлення, цэласнага ўяўлення аб гісторыі традыцыйнай культуры Беларусі ў іх суаднясенні з гісторыка-культурнай спадчынай;

- выхаванне і духоўна-маральнае развіццё навучэнцаў з дапамогай далучэння да вышэйшых нацыянальных і ўніверсальных каштоўнасцей.

Месца вучэбнай дысцыпліны “Культура Беларусі (са старажытных часоў – XVIII ст.)” у сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў вызначаецца тым, што прадметам яе вывучэння з’яўляюцца найбольш важныя пытанні культурнага, канфесійнага і духоўнага развіцця беларускага народа ў кантэксце

ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай культуры з улікам цывілізацыйных характарыстык.

Выкладанне і паспяховае вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Культура Беларусі (са старажытных часоў - XVIII ст.") ажыццяўляецца на базе набытых студэнтамі ведаў і ўменняў па раздзелах наступных навучальных дысцыплін:

1) "Філасофія" спрыяе пазнанню і тлумачэнню сутнасці культуры.

2) "Псіхалогія" дае магчымасць глыбей зразумець спецыфіку культурна-творчай дзейнасці чалавека, яго ўспрыманне каштоўнасцей культуры, станаўленне духоўнага свету асобы.

3) "Гісторыя Беларусі (старажытны час – першая палова XIII ст.)" і "Гісторыя Беларусі (другая палова XIII – сярэдзіна XVI стст.) дазваляе прасачыць эвалюцыю развіцця культуры, механізмы, рухаючыя сілы культурнага працэсу.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту выпускнік павінен **ведаць:**

асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі;

культурна-гістарычную спадчыну беларускага грамадства;

асноўныя этапы гісторыка-культурнай эвалюцыі насельніцтва беларускіх зямель.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту выпускнік павінен **умець:**

характарызаваць ролю і месца беларускіх зямель у сусветным культурным супольніцтве;

тлумачыць уплывы розных цывілізацыйных фактараў на развіццё і станаўленне культуры Беларусі на розных гістарычных этапах;

ацэньваць асноўныя дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры жыхароў Беларусі ў кантэксце гістарычнага развіцця;

аналізаваць культурна-гістарычныя з'явы ва ўмовах інтэграцыі і глабалізацыі.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту выпускнік павінен **валодаць:**

асноўнымі паняццямі ў галіне розных відаў мастацтваў ва ўзаемасувязі з маральна-каштоўнасным і стылявым зместам культуры эпохі;

ведамі аб асноўных тэндэнцыях развіцця сучаснай культуры ў свеце і ў Беларусі;

навыкамі агульнакультурнай, інтэлектуальнай падрыхтоўкі; сучаснымі, align рознабаковымі ўяўленнямі аб развіцці культуры; асновамі камунікабельнасці і культурнай мабільнасці.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Культура Беларусі (са старажытных часоў - XVIII ст.)" павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыялізаванай кампетэнцыі:

СК-4 Вылучаць асноўныя перыяды, тэндэнцыі і заканамернасці развіцця сусветнай і айчыннай культуры.

У рамках адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіваць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на другім курсе дзённай формы атрымання адукацыі ў трэцім семестры. Усяго на вывучэнне дысцыпліны “Культура Беларусі (са старажытных часоў – XVIII ст.)” адводзіцца ўсяго 100 гадзін (3 зал. адз.), з іх аўдыторных – 56 гадз.: лекцыі – 24 гадз., семінарскія заняткі – 32 гадз. Кіруемая самастойная работа – 6 гадзін: 2 гадзіны лекцыі, 4 гадзіны семінарскія). На пазааўдыторную самастойную работу адводзіцца 44 гадзіны. Форма кантролю – залік у 3 семестры.

На завочнай форме атрымання адукацыі на вучэбную дысцыпліну адводзіцца 100 гадзін (3 зал. адз.), з іх аудыторных – 14 гадзін (4 – лекцыйных і 10 – семінарскіх заняткаў). Самастойная работа – 86 гадзін. Форма кантролю – залік на 3 курсе.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**1. Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну “Культура Беларусі (са старажытных часоў – XVIII ст.)**

Гісторыя культуры Беларусі як навука і навучальная дысцыпліна. Айчынная культура – частка еўрапейскай і сусветнай культуры. Адметныя рысы гістарычнага развіцця культуры Беларусі, яе перыядызацыя. Крыніцы па гісторыі культуры Беларусі. Асноўныя накірункі вывучэння гісторыі культуры Беларусі. Сучасны стан навуковых даследаванняў. Значэнне вывучэння гісторыі беларускай культуры ў выхаванні патрыёта і грамадзяніна, носьбіта нацыянальных культурных каштоўнасцей.

**2. Культура беларускіх зямель ў эпоху першабытнага грамадства**

**2.1. Духоўная культура беларускіх зямель ў эпоху першабытнага грамадства**

Светапогляд першабытнага чалавека. Дахрысціянскія вераванні. Пакланенне аб'ектам жывой і нежывой прыроды. Анімізм. Татэмізм. Фетышызм. Магія. Культ сонца, зямлі, вады, дрэў, звяроў, агню. Капішчы. Ідалы. Пантэон язычніцкіх багоў. Персанажы народнай дэманалогіі (ваўкалак, лясун, русалка і інш.). Вытокі беларускага народнага каляндара. Святы каляндарнага цыкла. Каляды. Гуканне вясны. Вялікдзень. Культ продкаў (Радаўніца, Дзяды). Купалле. Абрады і звычаі. Сямейныя святы. Фальклор як адлюстраванне паганскіх уяўленняў. Архетыпы менталітэту.

**2.2. Матэрыяльная культура ў эпоху першабытнага грамадства**

Старажытныя паселішчы і гарадзішчы. Стаянкі эпохі позняга палеаліту: каля вёсак Бердыж Чачэрскага раёна і Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобл. Першыя архітэктурныя збудаванні: іх характар, функцыі, вонкавае аблічча. Матэрыяльная культура. Прылады працы. Прадметы хатняга ўжытку. Кераміка. Тэхніка яе вырабу. Арнамент. Упрыгожванні ў выглядзе арнаментаваных падвесак з біўня мамантa, зубоў і костак жывёл. З’яўленне дробнай пластыкі.

**3. Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.**

**3.1. Духоўная культура беларускіх зямель з прыняццем хрысціянства**

Распаўсюджванне хрысціянства. Яго ўплыў на культуру і светаўспрыманне чалавека. Узнікненне Полацкай і Тураўскай епархій. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы Беларусі: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўраамій Смаленскі. Народная культура. Вусная народная творчасць. Паданні, прыказкі, прымаўкі. Абрадавыя песні, магічныя замовы, заклінанні, клятвы. Быліны. Скамарошаства як сінтэтычны від народнага мастацтва. Дваяверства. Хрысціянскія і паганскія элементы ў культуры. Святы, звычаі, абрады.

**3.2. Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.: архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Горадабудаўніцтва. Планіроўка і забудова гарадоў. Гарадскія ўмацаванні. Ваеннае і грамадзянскае дойлідства. Замкі-данжоны. Камянецкая вежа.

Культавая архітэктура. Полацкая і гродзенская школы дойлідства. Іх адметныя рысы. Сафійскі сабор у Полацку. Спаская царква. Храмы Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра. Дойлід Іаан. Гродзенскія цэрквы. Барысаглебская (Каложская) царква. Віцебская Дабравешчанская царква. Мураваныя храмы іншых гарадоў Беларусі. Драўлянае дойлідства. Жывапіс. Мастацтва фрэскі. Манументальны роспіс Спаскай царквы. Візантыйска-кіеўскія ўплывы. Фрэскі полацкіх, віцебскага, навагрудскага, гродзенскага храмаў.

Іканапіс. Дэкаратыўна-прыкладное і ювелірнае мастацтва. Упрыгожанні. Прадметы культу. Майстар-ювелір Лазар Богша. Крыж Ефрасінні Полацкай і яго мастацкія вартасці.

**3.3. Пісьменнасць, літаратура у ІХ – першай палове ХІІІ ст.**

Помнікі эпіграфікі і пісьменства. Пячатка Ізяслава. Графіці. Барысавы камяні. Знаходкі берасцяных грамат. Бібліятэкі і скрыпторыі. Ефрасіння Полацкая. Тураўскае евангелле. Аршанскае евангелле. Літаратура. Перакладная літаратура. Кананічныя творы, патрыстыка, агіяграфія, пацерыкі і інш. Арыгінальная літаратура. Жыццё Ефрасінні Полацкай і Аўрамія Смаленскага. Аратарская проза. Асоба і творчасць Кірылы Тураўскага. Клімент Смаляціч. «Наказание» полацкага епіскапа Сімяона. Свецкая літаратура. «Слово о полку Игореве». Праблема летапісання ў Полацку і Віцебску. Іпацьеўскі летапіс. «Летописец Еропкина».

**4. Культура беларускіх зямель у другой палове ХІІІ – ХV ст.**

**4.1. Этнакультурныя працэсы ў развіцці беларускай культуры ў другой палове ХІІІ – ХV ст.**

Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага. Этнічныя працэсы на беларускіх землях. Роля і месца культуры ў фарміраванні беларускай народнасці. Станаўленне старажытнабеларускай мовы, яе дзяржаўны статус. Паходжанне назваў “Белая Русь”, “ліцвіны-беларусы”. Менталітэт беларускага народа. Этнічныя меншасці. Татарскае і яўрэйскае насельніцтва Беларусі – рассяленне, заняткі, культура. Іншыя народы ў этнічных і культурных працэсах на беларускіх землях. Станаўленне самабытнага беларускага фальклору. Сямейна-бытавыя святы. Цыклы абрадавай паэзіі. Казкі і іх тэматыка. Гістарычныя песні і паданні.

**4.2. Горадабудаўніцтва і развіццё абарончай архітэктуры беларускіх зямель у другой палове ХІІІ – ХV ст.**

Архітэктура і горадабудаўніцтва. Новы этап развіцця беларускага горада. Заходнееўрапейскія ўплывы. Кампазіцыйны цэнтр горада. Замак і «места». Абарончае дойлідства. Замкі-кастэлі. Ліда, Крэва, Меднікі. Замкі ў Віцебску, Гродне, Навагрудку.

**4.3. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва на беларускіх землях у другой палове ХІІІ – ХV ст.**

Манументальныя фрэскавыя роспісы. Візантыйска-рускія традыцыі. Рэалістычныя рысы. Люблін. “Еўхарыстыя”, “Тайная вячэра”, “Грамніцы”. Сандамір, Кракаў. Візантыйска-сербскія ўплывы. Станаўленне беларускай

школы іканапісу. Нараджэнне свецкага жывапісу (партрэт). Мастацкае аздабленне рукапісных евангелляў з Лаўрышава, Жыровічаў, Гродна.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Крыжы-энкалпіёны. Абразкі. Ювелірныя вырабы. Мастацкае шкло. Кавальскае майстэрства.

## 5. Культура Беларусі эпохі Адраджэння і Рэфармацыі ў XVI ст.

### 5.1. Эпоха Адраджэння і Рэфармацыі ў Беларусі ў XVI ст.

Перадумовы пашэрэння ідэй Адраджэння ў Беларусі. Агульнае і адметнае ў айчынным і заходнееўрапейскім Рэнэсансе. Уплыў рэнэсанса на айчынную культуру. Пашырэнне Рэфармацыі і яе асноўныя напрамкі. Дзейнасць Мікалая Радзівіла Чорнага ў распаўсюджванні ідэй Рэфармацыі. Пратэстантызм. Кальвінізм, лютэранства. Якуб з пад Калінаўкі, Павел з Візны, Васіль Цяпінскі. Вынікі рэфармацыйнага руху ў Беларусі. Віленскі прывілей 1563 г. “Аб ураўноўванні ў правах ўсёй шляхты незалежна ад верывызнання”, “Акт аб свабодзе веравызнання (1573 г.). Пазіцыя праваслаўнай царквы ў часы Рэфармацыі.

### 5.2. Грамадска-палітычная, прававая культура. Адукацыя

Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг. – помнікі грамадска палітычнай і прававой ідэі. Астафій Валовіч, Леў Сапега. Гуманістычныя ідэі ў духоўнай спадчыне Францыска Скарыны, Мікалая Гусоўскага, Сымона Буднага, Міхалона Літвіна. Адукацыя. Канфесійны характар асветы. Пратэстанцкія школы. Вучоба моладзі ў еўрапейскіх універсітэтах.

### 5.3. Архітэктура беларускіх зямель ў XVI ст.

Прыватнаўласніцкія замкі. Замак у Міры – унікальны помнік айчыннага дойлідства. Нясвіж. Замкі ў Гернянах, Ляхавічах. Фарміраванне палацава-замкавых комплексаў. Архітэктурныя стылі. Рэнесанс. Беларуская готыка. Храмы абарончага тыпу. Касцёлы ў Ішкалдзі, Камаях. Цэрквы-крэпасці ў Сынкавічах, Мураванцы, Супраслі. Іх знешні дэкор і інтэр'ер. Пратэстанцкія зборы. Дом-крэпасць у Гайцюнішках.

### 5.4. Кнігадрукаванне

Францыск Скарына – пачынальнік усходнеславянскага і беларускага кнігадрукавання. Пражскія і віленскія выданні Ф. Скарыны. Працяг друкарскай справы ў другой палове XVI ст. ў Вільне, Брэсце, Нясвіжы, Заблудаве, Лоску. Пратэстанцкія кнігадрукары. Брэсцкая друкарня М. Радзівіла Чорнага. Сымон Будны. «Катэхізіс» і іншыя выданні. Васіль Цяпінскі. Прыватныя і брацкія друкарні. Бібліятэкі Супрасльскага манастыра і Полацкага Сафійскага сабора. Прыватныя зборы.

### 5.5. Выяўленчае мастацтва беларускіх зямель ў XVI ст.

Манументальны жывапіс. Супрасль. Роспісы Куцеінскага Богаяўленскага манастыра, магілёўскіх храмаў. Сармацкі партрэт, яго параднасць. Мініяцюры і кніжная графіка. Гравюры выданняў Ф. Скарыны. Т. Макоўскі. Развіццё беларускай школы жывапісу. “Хрыстос Уседзяржыцель” з Быцені (XVI ст.), “Святая Параскева” з Случчыны (XVI ст.), “Маці Божая Адзігітрыя Смаленская” (XVI ст.) з Дубенца. Скульптура і пластыка. Раманскі і гатычны

стылі. Алтарная скульптура. “Распяцце”. “Св. Гжэгаж”. Майстар-разбяр Ананія. Мемарыяльная пластыка. Надмагіллі з віленскай катэдры. Нясвіжскія надмагіллі Радзівілаў. Медальернае мастацтва.

**6. Культура эпохі Контррэфармацыі і барока на беларускіх землях у XVI – XVII ст.**

**6.1. Развіццё беларускай культуры ва ўмовах Контррэфармацыі і паланізацыі ў другой палове XVI – пачатку XVII ст.**

Узмацненне каталіцкай рэакцыі. Пачатак Контрэфармацыі. Дзейнасць манаскіх ордэнаў на беларускіх землях. Езуіты. Петр Скарга. Перадумовы Брэсцкай царкоўнай уніі. Кніга Пятра Скаргі “Аб адзінстве царквы Божай” (1577 г.). Брэсцкі царкоўны сабор 1596 г. Асноўныя ўмовы аб’яднання па Брэсцкай царкоўнай уніі. Уплыў царкоўнай уніі на стан беларускай культуры. Распаўсюджванне уніяцтва. Перамога Контррэфармацыі. Барацьба супраць царкоўнай уніі. Мяцелій Сматрыцкі. Паланізацыя беларускай культуры. Праблемы самазахавання беларускай культуры ва ўмовах ўзмацнення паланізацыі. Статус старабеларускай мовы. Народная культура – галоўны асяродак захавання беларускай нацыянальнай культуры. Вусная народная творчасць. Сацыяльныя матывы.

**6.2. Літаратура і адукацыя ў канцы XVI – XVII ст.**

Змена жанраў і форм гістарычнай літаратуры. Узнікненне гісторыка-мемуарнага, палемічнага, сатырычнага літаратурных жанраў. Баркулабаўскі летапіс. Дзённік Ф. Еўлашэўскага. Перакладная літаратура. Рыцарскі раман і воінская аповесць. “Троя”. “Александрыя”. “Аповесць пра Трышчана і Іжоту”. Уздым арыгінальнай свецкай літаратуры ў канцы XVI – пачатку XVII ст. “Допісы» Ф. Кміты-Чарнабыльскага. Сатырычныя творы. “Прамова Мялешкі”, “Ліст да Абуховіч”. Паэзія. Зараджэнне паэзіі на старабеларускай мове. Францыск Скарына. “Епіграмы”. Андрэй Рымша. Лявон Мамоніч. Паэт-патрыёт Ян Пашкевіч. Паэты-лаціністы. Мікола Гусоўскі. “Песня пра зубра”. Ян Вісліцкі. “Пруская вайна”. Перакладная і арыгінальная царкоўная літаратура. Агіяграфія. Апакрыфічныя творы. Гуманістычныя тэндэнцыі ў творчасці Рыгора Цамблака. Рэлігійная палеміка канца XVI – першай паловы XVII ст. Праваслаўныя публіцысты. Мяцелій Сматрыцкі. “Фрынас”. Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі. Лявонцій Карповіч. Каталіцкія і ўніяцкія палемісты. Петр Скарга і Іпацій Пацей.

Адукацыя. Віленскі універсітэт (1579 г.) і яго першы рэктар Петр Скарга. Праваслаўныя брацтвы ў Беларусі, іх культурна-асветніцкая дзейнасць. Сістэма адукацыі езуітаў. Калегіумы. Базыльянскія навучальныя ўстановы. Навука. Казімір Семяновіч, Юзаф Нарановіч-Наронскі, Ілья Капіевіч.

**6.3. Архітэктура беларускіх зямель ў канцы XVI–XVII ст.**

З’яўленне і сцвярджэнне новага мастацкага стылю – барока. Перыядызацыя барока ў беларускай культуры. Помнікі ранняга і сталага барока, іх характэрныя рысы. Распаўсюджванне палацава-сядзібнага будаўніцтва (комплексы ў Гальшанах, Смалянах, Нясвіжы, Слоніме, Воўчыне, Гродне). Спалучэнне рысаў позняга барока і ракако. Культавыя пабудовы.

Драўлянае дойлідства на Палессі, яго адметнасці. Складванне асноўных рысаў нацыянальнага дойлідства.

**6.4. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ў канцы XVI – XVII ст.**

Жывапіс і графіка. Фрэскавы роспіс (Багаяўленская царква Куцеінскага манастыра ў Магілеве, Святадухаўская царква Тупічэўскага манастыра ў Мсціславе, Троіцкай царкы Маркава манастыра ў Віцебску). Афармленне і выдзяленне мясцовых школ жывапісу. Віленская і Куцеінская школы гравюры. Кніжная графіка. Спірыдон Собаль, Лявонцій Тарасевіч і інш. Узмацненне заходніх уплываў і рэалістычных тэндэнцый. Адлюстраванне барочнай эстэтыкі ў іканапісе. Развіццё партрэтнага жанру. Рыцарскі, тунны, эпітафійны. Прыдворныя жывапісцы Барталамей Стробель, Іаган Шрэтэр.

Скульптура і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Разьба па дрэве. Майстар Пётр з Нягневічаў. Іканастасы, царскія брамы, алтары. Іканастас Мікалаеўскай царквы ў Магілёве. Інтэр’еры касцёлаў у Пінску, Гродне, Слоніме. Мастацкае шкло. Вырабы Налібоцкай і Урэцкай мануфактур. Слуцкія паясы. Перасяленне беларускіх рамеснікаў у Расію. Дзейнасць беларускіх майстроў у Маскве. Беларуская разьба. Арцель Кліма Міхайлава. Іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве. Палац у Каломенскім. Творы беларускіх майстроў у Аружэйнай, Залатой, Срэбранай палатах Маскоўскага Крамля. Цаніннае майстэрства. Арцель Ігната Максімава.

**6.5. Тэатр і музыка ў канцы XVI – XVII ст.**

Тэатр і музыка. Традыцыі народнага мастацтва. Скамарохі, мядзведзнікі. Узнікненне лялечнага тэатра “Батлейка”. Станаўленне самабытнага жанру кантавай песеннай культуры. Музыка ў касцёле. Арган і хор. Музычныя інструменты. Музыка барока – “Полацкі сшытак”. Школьны тэатр. Тэатры пры брацкіх школах і езуіцкіх калегіумах. Прыдворныя капэлы, тэатры, аркестры, балетныя трупы. Асаблівасці іх рэпертуару. Музычныя школы ў Нясвіжы, Слоніме, Слуцку, Гродне, Шклове і іншых гарадах, іх еўрапейская слава. Мецэнацтва магнатаў. Міхал Агінскі, яго “Сядзіба музаў” у Слоніме.

**7. Айчынная культура ў канцы XVII - XVIII стст. Асветніцтва на беларускіх землях**

**7.1. Літаратура і грамадска-палітычная думка ў канцы XVII – першай палове XVIII ст.**

Развіццё лаціна-моўнай паэзіі. Мацей Сарбеўскі. Паэзія Сімяона Полацкага. “Псалтырь рифмотворная”, “Вертоград многоцветный”, “Рифмологион”. Барочныя рысы. Уклад Сімяона Полацкага ў культуру Беларусі і Расіі. Ян (Андрэй) Белабоцкі. Філасофска-тэалагічныя роздумы. Заняпад старабеларускай літаратуры. Працяг гумарыстычнай традыцыі. “Прамовы русіна”. Каятан Марашэўскі. “Камедыя”. Міхал Цяцерскі. Інтэрмедыі. “Селянін у касцёле”, “Чорт Асмалейка” і інш. Грамадска-палітычная думка. Погляды на ўладу і грамадства Сімяона Полацкага. Ілья Капіевіч. Георгій Каніскі і абарона праваслаўя ў Рэчы Паспалітай. Перамога Контррэфармацыі. Казімір Лышчынскі. Трактат “Аб неіснаванні Бога”.

**7.2. Асветніцтва і навука**

Асветніцтва на беларускіх землях. Агульнае і адметнае ў айчынным і заходнееўрапейскім. Дзейнасць Іяхіма Храптовіча, Ільі Еленскага. Развіццё адукацыі. Дзейнасць Эдукацыйнай камісіі (1773–1794 гг.). Сістэма адукацыі на беларускіх землях. З'яўленне свецкага навучання. Дзейнасць Галоўнай школы ВКЛ. Навука. Георгій Каніскі, Казімір Нарбут, Саламон Майман, Адам Нарушевіч, Марцін Пачобут-Адляніцкі. З'яўленне першых прафесійных вучэбных ўстаноў. Гродзенская медыцынская акадэмія. Жан Жылібер.

**7.3. Горадабудаўніцтва і дойлідства ў канцы XVII – першай палове XVIII ст.**

Росквіт архітэктуры барока. Сталае барока. Магілёўская школа дойлідства. Касцёл і кляштар бернардынак у Мінску. Позняе (віленскае) барока і яго адметнасць. Ян Гляўбіц, Матэус Пёпельман, Джузэпэ Сака. Полацкі Сафійскі сабор. Фарны касцёл у Гродне. Віцебская ратуша. Нясвіжскія помнікі. Беразвецкі сабор. Пачатак распаўсюджвання класіцызму. Помнікі, пераходныя ад барока да класіцызму. Палацы ў Свяцку, Шчорсах, Ружанах. Змены ў планіроўцы гарадоў. Антоні Тызенгаўз. Прадмесце Гарадніца, Паставы. Міхаіл Агінскі. Слонім. Драўляная архітэктура. Ільінская царква ў Віцебску. Ратуша ў Чачэрску. Рысы народнага дойлідства.

**7.4. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ў канцы XVII – першай палове XVIII ст.**

Жывапіс і графіка. Узмацненне заходніх уплываў і рэалістычных тэндэнцый. Фрэскавы жывапіс. Роспісы праваслаўных і уніяцкіх цэркваў у Магілёве, Мсціславе, Віцебску. Фрэскі касцёлаў св. Станіслава ў Магілёве, Божага Цела ў Нясвіжы. Уздым беларускай школы іканапісу. Абразы "Маці Божая Адзігітрыя Баркулабаўская", "Сашэсце ў пекла", "Грамніцы". Магілёўскі майстар Афанас Пігарэвіч. Ксаверый Дамінік Гескі. "Тайная вячэра". Уплывы класіцызму. Кніжная гравюра. Аляксандр і Лявонцій Тарасевічы. Магілёўская гравёрная школа. Максім і Васіль Вашчанкі. Фёдар Ангілейка. Герш Ляйбовіч. "Выявы княжацкай Радзівілаўскай сям'і". Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Кафлярства. Мастацкае шкло. Налібоцкая і Урэцкая шкляныя мануфактуры.

**7.5. Архітэктура ў другой палове XVIII ст.**

Архітэктура. Панаванне класіцызму. Новыя планы гарадоў. Палацава-паркавыя комплексы. Дзейнасць Румянцавых. Гомель. Палацы Агінскіх у Залессі, Тызенгаўза ў Паставах. Сядзібны дом Лаўчынскіх у Відзах. Уплывы рамантызму. Пейзажныя і пейзажна-рамантычныя паркі. Мураванае культавае дойлідства. Магілёўскі Іосіфаўскі і Гомельскі Петрапаўлаўскі саборы. Касцёл Св. Тэрэзы ў Шчучыне. Адміністрацыйна-грамадскія будынкі. Палацы губернатараў. Губернскія праўленні. Грамадзянская архітэктура. Будынак Дваранскага сходу ў Слуцку. Аб'екты гандлёва-гаспадарчага прызначэння. Карпусы навучальных устаноў.

**7.6. Выяўленчае мастацтва ў другой палове XVIII ст.**

Выяўленчае мастацтва. Жывапіс. Перавага свецкіх твораў. Найбуйнейшыя мастацкія школы. Факультэт жывапісу, скульптуры і графікі

Віленскага ўніверсітэта. Францішак Смуглевіч, Іосіф Аляшкевіч, Ян Дамель. Імператарская Акадэмія мастацтваў у Санкт-Пецярбургу. Накірункі. Класіцызм. Акадэмізм. Рамантызм. Скульптура. Барэльефы і медальёны. Манументальна-дэкаратыўная скульптура. Унутраны і знешні дэкор палацаў і сядзіб.

**7.7. Музычнае і тэатральнае мастацтва**

Прыватнаўласніцкія тэатры Радзівілаў ў Нясвіжы, Слуцку. Творы Францішка Уршуля Радзівіл. Тэатр Міхаіла Агінскага ў Слоніме. Ружанскі і Дзярэчынскі тэатры Сапег, Шклоўскі тэатр Сямёна Зорыча. Рамантычная плынь у музычным мастацтве. Распаўсюджванне оперы і паланэзаў ў музычным мастацтве. Опера “Агатка, або прыезд Пана” (па творах Станіслава Радзівіла (Пане Каханку, музыка Яна Давіда Голанда). Паланэз Міхаіла Агінскага “Развітанне з Радзімай”.

**7.8. Народная культура ў XVII – першай палове XVIII ст.**

Сялянскі быт. Беларускае народнае жыллё. Хата, яе знешняе і ўнутранае аздабленне. Мэбля. Хатняе начынне. Сялянская сядзіба. Беларускі нацыянальны касцюм, яго асноўныя элементы (ў мужчын і жанчын), лакальныя разнавіднасці (народныя строі). Беларускі народны каляндар. Менталітэт. Абрады і звычаі. Народны этыкет. Адзенне і быт вышэйшых саслоўяў.

**7.9. Агульная характарыстыка развіцця культуры са старажытных часоў – XVIII ст.**

Асноўныя тэндэцыі развіцця беларускай культуры са старажытных часоў – XVIII ст. З’яўленне стыляў і напрамкаў у беларускай культуры ў X–XVIII ст. Пераасэнсаванне лепшых традыцый рускага і заходнееўрапейскага мастацтва ў архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладным і выяўленчым мастацтве Беларусі. Вядомыя імёны дзеячоў беларускай культуры і іх ўклад у яе развіццё.

**Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны “Культура Беларусі (са старажытных часоў – XVIII ст.”)**
**па спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| № тэмы | Назва тэмы | Колькасць адыторных гадзін | | | Самастойная (пазааўдыторная работа) | Метадычныя сродкі забяспячэння, дапаможнікі | Літаратура | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | Кіруемая самастойная работа | | | | |
| | **Трэці семестр** | **22** | **28** | **6** | **44** | | | |
| **1** | **Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну “Культура Беларусі (са старажытных часоў – XVIII ст.)”**<br>1. “Культура Беларусі (са старажытных часоў – XVIII ст.)” – як навука.<br>2. Крыніцы і гістарыяграфія. Сучасны стан навуковых даследаванняў.<br>3. Значэнне вывучэння культуры Беларусі ў выхаванні патрыёта і грамадзяніна, носьбіта нацыянальных культурных каштоўнасцей. | **2** | | | | | [2] | |
| **2** | **Культура беларускіх зямель ў эпоху першабытнага грамадства** | **2** | **2** | | **2** | | | |
| 2.1 | **Духоўная культура беларускіх зямель ў эпоху першабытнага грамадства**<br>1. Дахрысціянскія вераванні.<br>2. Вытокі беларускага народнага каляндара.<br>3. Абрады і звычаі старажытных беларусаў.<br>4. Фальклор як адлюстраванне паганскіх уяўленняў. | 2 | | | 2 | Прэзента-цыя | [1]<br>[2] | |
| 2.2 | **Матэрыяльная культура ў эпоху першабытнага грамадства**<br>1. Жыллё старажытных продкаў беларусаў. | | 2 | | | | [1]<br>[2] | Праверка канспектаў |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Першыя архітэктурныя збудаванні: іх характар, функцыі, вонкавае аблічча.<br>3. Матэрыяльная культура.<br>4. Прылады працы. Прадметы хатняга ўжытку. Кераміка. Тэхніка яе вырабу. Арнамент. | | | | | | | |
| **3** | **Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.** | **2** | **4** | | **6** | | | |
| 3.1 | **Духоўная культура беларускіх зямель з прыняццем хрысціянства**<br>1. Распаўсюджванне хрысціянства.<br>2. Дваяверства. Хрысціянскія і паганскія элементы ў культуры.<br>3. Дзейнасць Е. Полацкай, К. Тураўскага, К. Смаляціча, А. Смаленскага. | 2 | | | 2 | Прэзента-цыя | [1]<br>[2] | |
| 3.2 | **Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.: архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**<br>1. Горадабудаўніцтва.<br>2. Мураванае дойлідства, яго абарончы характар.<br>3. Полацкая і гродненская архітэктурныя школы.<br>4. Манументальны жывапіс. Іканапіс.<br>5. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. | | 2 | | 2 | | [1]<br>[2] | Падрыхтоўка і<br>абарона прэзента<br>цый |
| 3.3 | **Пісьменнасць, літаратура ў IX – першай палове XIII ст.**<br>1. Помнікі эпіграфікі і пісьменства.<br>2. Пачатак летапісання на беларускіх землях.<br>3. Мастацтва рукапіснай кнігі.<br>4. Агіяграфічная (жыційная) літаратура. Беларуская тэматыка ў “Слове о полку Игоревым”. | | 2 | | 2 | | [1]<br>[2] | Вуснае апытанне |
| 4 | **Культура беларускіх зямель у другой палове XIII – XV ст.** | **2** | **4** | | **4** | | | |
| 4.1 | **Этнакультурныя працэсы ў развіцці беларускай культуры ў другой палове XIII – XV ст.**<br>1. Фарміраванне беларускай народнасці.<br>2. Тэорыі паходжання назвы “Белая Русь”.<br>3. Этнічныя меншасці ў рэлігійных і культурных працэсах на беларускіх землях. | 2 | | | 2 | Прэзента-цыя | [1]<br>[2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.2 | **Горадабудаўніцтва і развіццё абарончай архітэктуры беларускіх зямель у другой палове XIII – XV ст.**<br>1. Архітэктура і горадабудаўніцтва.<br>2. Абарончае дойлідства. Замкі-кастэлі. Ліда, Крэва, Меднікі. Замкі ў Віцебску, Гродне, Навагрудку. | | 2 | | 1 | | 1]<br>[2] | Праверка творчых заданняў |
| 4.3 | **Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва на беларускіх землях у другой палове XIII – XV ст.**<br>1. Манументальны жывапіс.<br>2. Станаўленне беларускай школы іканапісу<br>3. Нараджэнне свецкага жывапісу (партрэт).<br>4. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. | | 2 | | 1 | | [1]<br>[2] | Падрыхтоўка і абарона прэзента цый |
| **5** | **Культура Беларусі эпохі Адраджэння і Рэфармацыі ў XVI ст.** | **4** | **4** | **2 с.** | **6** | | | |
| 5.1 | **Эпоха Адраджэння і Рэфармацыі ў Беларусі ў XVI ст.**<br>1. Перадумовы пашэрэння ідэй Адраджэння ў Беларусі.<br>2. Пашырэнне Рэфармацыі і яе асноўныя напрамкі. Вынікі рэфармацыйнага руху ў Беларусі.<br>3. Уплыў Рэнесанса і Рэфармацыі на айчынную культуру. | 2 | | | 1 | Прэзентацыя | [1]<br>[2] | |
| 5.2 | **Грамадска-палітычная, прававая культура. Адукацыя.**<br>1. Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг. – помнікі грамадска палітычнай і прававой ідэі.<br>2. Гуманістычныя ідэі ў духоўнай спадчыне Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С.Буднага, М. Літвіна.<br>3. Адукацыя. Канфесійны стан асветы. | | 2 | | 1 | | [1]<br>[2] | Напісанне эссе |
| 5.3 | **Архітэктура беларускіх зямель ў XVI ст.**<br>1. Готыка, ренесанс – мастацкія стылі ў дойлідстве Беларусі ў XVI ст.<br>2. Прыватнаўласніцкія замкі.<br>3. Абарончае культавае дойлідства. | 2 | | | 1 | Прэзентацыя | [1]<br>[2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
